**ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**2024/2025 навучальны год**

**Комплексная работа**
**10 клас**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Выпішыце нумары правільных сцверджанняў:**

*Колькасць балаў – 6*

1. Паўторныя злучнікі **ці – ці, то – то** служаць для выражэння паміж часткамі толькі адносін чаргавання.
2. Дзеясловы змяняюцца па часах, асобах (у цяперашнім і будучым часе), ліках, родах (у цяперашнім і прошлым часе).
3. Корань – агульная частка роднасных слоў.
4. Сродкамі, якія забяспечваюць марфалагічную сувязь у тэксце, з’яўляюцца: займеннікі, прыслоўі, формы аднаго і таго ж слова, правільнасць прычынна-выніковых сувязей, злучнікі.
5. Назоўнік можа быць любым членам сказа.
6. Род, лік і склон прыметніка залежаць ад назоўніка.
7. Дзеепрыслоўі незакончанага трывання ўтвараюцца ад асновы будучага часу дзеясловаў незакончанага трывання.
8. Фразеалагізмы з’яўляюцца адным членам сказа.
9. Дзейнік і выказнік словазлучэннем не з’яўляюцца.
10. Дапасаваныя азначэнні звычайна звязваюцца з паяснёным словам спосабам кіравання.

**Адказ: ____________________**

**Заданне 2. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| А. Перамываць | 1. языка |
| Б. Ні ў адным | 2. косці |
| В. Зрывацца з | 3. агарод |
| Г. Ліць ваду на | 4. воку |
| Д. Браць на | 5. млын |
| Е. Каменьчык у | 6. мушку |

Адказ: А ___, Б ___, В ____, Г ___, Д ___, Е___.

**Заданне 3. Выпішыце нумары слоў, у якіх націск падае на трэці склад.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| 1. Метанімія | 7. Таварыскасць |
| 2. Спакваля | 8. Ашчыпаны |
| 3. Нумарны | 9. Відарыс |
| 4. Садавіна | 10. Грунтавы |
| 5. Параліч | 11. Дзеячы |
| 6. Паліграфія | 12. Дачырвана |

**Адказ: ________________________**

**Заданне 4. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Заболеть гриппом | |
| Шутить над подругой | |
| Похожий на брата | |
| Заведующий детской библиотекой | |
| Своими (собственными) глазами видеть | |
| Принести угощения к праздничному столу | |

**Заданне 5. Ад наступных назоўнікаў, дзе гэта магчыма, утварыце форму множнага ліку.**

*Колькасць балаў – 6*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1. Племя | | 6. Зрок | |
| 2. Збожжа | | 7. Абруч | |
| 3. Барана | | 8. Лісце | |
| 4. Сцябло | | 9. Пыл | |
| 5. Медзведзяня | | 10. Ліст | |

**Заданне 6. Ад прапанаваных дзеясловаў ўтварыце дзеепрыметнікі.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Прыручыць | |
| Сцерці | |
| Счарсцвець | |
| Узгадаваць | |
| Зарасці | |
| Прыклеіць | |

**Заданне 7. Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы.**

*Колькасць балаў – 6*

| Сказ | Часціна мовы |
|---|---|
| А. Фалькларысты – гэта людзі, дзякуючы **якім** мы маем самы багаты ў Еўропе зборнік твораў вуснай народнай творчасці. | 1. Прыназоўнік |
| Б. **Скрозь** цёмныя шыбы ў хату глядзеў задумлівы месяц. | 2. Супраціўны злучнік |
| В. Па прасторнай дарозе ісці добра, **аднак** цікавей крочыць нязведанай сцежкай. | 3. Падпарадкавальны злучнік |
| Г. Расцвілі кветкі, **і** ад пчол руплівых зазвінела зямля. | 4. Спалучальны злучнік |
| Д. Адзін **і** ў кашы няспорны. | 5. Часціца |
| Е. Другі месяц вясны мы завём красавіком, **бо** зямля ў гэты час па-сапраўднаму красуе. | 6. Адносны займеннік |

**Адказ: А ___, Б ___, В ____, Г ___, Д ___, Е___.**

**Заданне 8. Падкрэсліце “чацвёртае лішняе”.**

*Колькасць балаў – 6*

1. Гіпербала, метафара, апісанне, анапест.
2. Партрэт, апавяданне, раманс, развязка.
3. Трыялет, нарыс, санет, элегія.

**Заданне 9. Па апісанні пазнайце героя, запішыце яго імя, назву і аўтара твора.**

*Колькасць балаў – 6*

| Урывак з твора | Імя героя | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| 1. Гэта гераіня жыве ў вялікім старажытным маёнтку, бацька яе трагічна загінуў, сама яна знаходзіцца ў пастаянным чаканні смерці, а ў наваколлі адбываецца шмат страшных і незразумелых падзей. | | | |
| 2. Гэты літаратурны персанаж мае некалькі мянушак, вымушаны вучыцца ў польскамоўнай школе, рознымі спосабамі змагаецца за магчымасць вучыцца на роднай мове, за што і быў выключаны са школы. | | | |

**Заданне 10. Выпішыце нумары правільных сцверджанняў.**

*Колькасць балаў – 6*

1. Васіль Шаранговіч – ілюстратар паэмы Янкі Купалы “Курган”.
2. Твор “Ля вогнішч начлежных” – урывак з паэмы Максіма Танка “Пестунь”.
3. Музыку да песні “Радзіма мая дарагая…” напісаў Уладзімір Алоўнікаў.
4. Лёня Міхневіч і Грыша Саўчанка – галоўныя героі апавядання Алены Васілевіч “Сябры”.
5. Максім Лужанін быў літаратурным сакратаром Янкі Купалы.
6. Выканаўцам песні “Слуцкія ткачыхі” на верш Максіма Багдановіча быў Уладзімір Мулявін.
7. Твор “Хмарка” Якуб Колас уключыў у зборнік “Казкі жыцця”.
8. Заір Азгур – аўтар помніка Якубу Коласу і яго літаратурным героям у Мінску.
9. Ян Чачот – адзін з першых аўтараў беларускамоўных тэкстаў, каго мы ведаем па імені.
10. У манастырскіх скрыпторыях займаліся друкаваннем і перапісваннем кніг.

**Адказ: ______________________**

**ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**2024/2025 навучальны год**

**Комплексная работа**
**10 клас**

**ДАВЕДКІ**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **60** |

**Заданне 1.**

2, 3, 5, 6, 8, 9

**Заданне 2.**

А2, Б4, В1, Г5, Д6, Е3

**Заданне 3.**

1, 2, 6, 7, 9, 10

**Заданне 4.**

| | |
|---|---|
| Заболеть гриппом | Захварэць на грып |
| Шутить над подругой | Жартаваць з сяброўкі |

| | |
|---|---|
| Похожий на брата | Падобны да брата |
| Заведующий детской библиотекой | Загадчык дзіцячай бібліятэкі |
| Своими собственными глазами видеть | На свае (уласныя) вочы бачыць |
| Принести угощения к праздничному столу | Прынесці пачастункі да святочнага стала |

**Заданне 5.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1. Племя | плямёны | 6. Зрок | не ўтв. |
| 2. Збожжа | не ўтв. | 7. Абруч | абручы |
| 3. Барана | бароны | 8. Лісце | не ўтв. |
| 4. Сцябло | сцёблы | 9. Пыл | не ўтв. |
| 5. Медзведзяня | медзведзяняты | 10. Ліст | лісты |

**Заданне 6.**

| | |
|---|---|
| Прыручыць | прыручаны |
| Сцерці | сцёрты |
| Счарсцвець | счарсцвелы |
| Узгадаваць | узгадаваны |
| Зарасці | зарослы |
| Прыклеіць | прыклеены |

**Заданне 7.**

А6, Б1, В2, Г4, Д5, Е3

**Заданне 8.**

1. Гіпербала, метафара, <u>апісанне</u>, анапест.
2. Партрэт, апавяданне, <u>раманс</u>, развязка.
3. Трыялет, <u>нарыс</u>, санет, элегія.

**Заданне 9.**

| Урывак з твора | Імя героя | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| 1. Гэта гераіня жыве ў вялікім старажытным маёнтку, бацька яе трагічна загінуў, сама яна знаходзіцца ў пастаянным чаканні смерці, а ў наваколлі адбываецца шмат страшных і незразумелых падзей. | Надзея Яноўская | “Дзікае паляванне караля Стаха” | Уладзімір Караткевіч |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2. Гэты літаратурны персанаж мае некалькі мянушак, вымушаны вучыцца ў польскамоўнай школе, рознымі спосабамі змагаецца за магчымасць вучыцца на роднай мове, за што і быў выключаны са школы. | Данік Малец | “Сірочы хлеб” (“урокі пані Мар’і”) | Янка Брыль |

**Заданне 10.**
1, 3, 6, 7, 8, 9